Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 59 (128)
АЎТОРАК
12
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ТАРФЯНОГА СЕЗОНУ

XVIII з'езд нашай партыі ў сваіх рашэннях запісаў, што неабходна „разгарнуць на месцах тарфяную прамысловасць... У мэтах скарачэння перавозак вугалю на далёкія адлегласці, павялічыць вытворчасць тарфяных брыкетаў і абязводжанага торфу".

У заходніх абласцях БССР маюцца вялікія тарфяныя масівы. У адной Беластоцкай вобласці, па няпоўных даных брыгады Дзяржплана БССР, 15 процантаў усёй паверхні вобласці— 290 тысяч га—складаюць тарфяныя балоты. У тым ліку маецца 50 тысяч га масіваў прамысловага значэння, да эксплаатацыі якіх можна прыступіць у гэтым годзе. Гэтыя масівы могуць даць 140 мільёнаў тон сухога торфу.

Вялікае значэнне маюць тарфяныя масівы каля мястэчак Гарадок і Міхалова, бо яны знаходзяцца блізка ад чыгуначнай лініі Беласток—Ваўкавыск. Тарфяныя масівы маюцца каля гарадоў Ломжы і Бельска.

Польская памешчыцка-капіталістычная ўлада глядзела на Заходнюю Беларусь, як на сваю калонію. Яна затрымлівала гаспадарчае жыццё Заходняй Беларусі на самым нізкім узроўні. Здабычы торфу — гэтага каштоўнага паліва — не ўдзялялася ніякай увагі, каб не падарваць інтарэсы і прыбыткі вугальных баронаў і акцыянерных таварыстваў Верхняй Сілезіі і Дамброўскага басейна. Торф здабываўся выключна саматужным метадам некаторымі памешчыкамі і кулакамі ў няначнай колькасці.

Толькі з вызваленнем Заходняй Беларусі, яе з'еднаннем з БССР адкрываюцца бліскучыя перспектывы для выкарыстання велізарных паліўных рэсурсаў, якімі з'яўляюцца тарфяныя масівы нашай вобласці.

У 1938 годзе Беластоцкая вобласць выдаткавала 180 тысяч тон каменнага вугалю. Увесь гэты вугаль патрэбна зараз замяніць другімі відамі паліва. Узмацняючы тэмпы лесазагатовак, патрэбна аднachасова ўсё больш і больш пераключацца на торф, як самы танны і даступны від паліва, якое можа поўнасцю замяніць вугаль і стаць энергетычнай базай для нашай разгортваемай прамысловасці. Ужо намечана перавесці беластоцкую і гродненскую электрастанцыі з атаплення вугалем на торф.

Па панярэдніх заяўках гаспадарчых арганізацый, паступіўшых у аблплан, патрэба ў тарфяным паліве на перыяд 1940—1941 года перавышае 300 тысяч тон. Прадстаіць велізарная работа. Намячаецца, што торфараспрацоўкі будуць весціся асобнымі трэстамі для задавальнення патрэб іх прадпрыемстваў. Адначасова абласны аддзел Наркамата паліўнай прамысловасці павінен будзе арганізаваць торфараспрацоўкі для забеспячэння паліўам мясцовай прамысловасці і насельніцтва.

Не гледзячы на тое, што ўсе і ўсюды прызнаюць неабходнасць торфараспрацовак, на справе зроблена яшчэ вельмі мала. Яшчэ не складзены планы распрацовак тарфяных масіваў, яшчэ не разгорнуты, як належыць, даследчыя работы.

Беластоцкі абласны аддзел Наркоммясцпрома не праяўляе патрэбнай ініцыятывы ў гэтым напрамку, не дабіваецца паскарэння тэмпаў падрыхтоўкі да тарфянога сезону і вельмі позна ўзяўся за падрыхтоўку кадраў тарфянікаў. Курсы тарфянікаў павінны былі працаваць яшчэ ў студзені, а між тым, набор курсантаў пачаўся толькі ў канцы лютага і ў пачатку сакавіка.

Працаёмкія працэсы торфараспрацовак патрабуюць самай шырокай механізацыі. Механізацыя торфаздабычы ў нашай вобласці будзе, безумоўна, укаранена, як і ва ўсходніх абласцях БССР. Але, разам з гэтым, патрэбна поўнасцю выкарыстаць усе маючыяся саматужныя машыны і прылады для таго, каб у гэтым годзе здабыць чым больш торфу. Аднак усе гэтыя машыны яшчэ не сканцэнтраваны ў руках арганізацый, якія будуць весці торфараспрацоўкі. Нічога яшчэ не зроблена для прыстасавання рабочых месц, для падрыхтоўкі жылёвых памяшканняў і своечасовага набору рабочых-сезоннікаў.

Гэта з'яўляецца рэзультатам таго, што абласныя арганізацыі, у першую чаргу абласны аддзел Наркоммясцпрома, замест энергічнай і ініцыятыўнай падрыхтоўкі да тарфянога сезону пусцілі гэтую справу на самацёк.

Час ідзе, набліжаецца вясна, а разам з ёй і тарфяны сезон. Справа торфараспрацоўкі павінна быць даручана ініцыятыўным, здольным таварышам, якія-б забяспечылі большэвіцкую работу.

Аблвыканком, райвыканкомы, а таксама партыйныя арганізацыі павінны ўзяць справу торфараспрацовак пад свой штодзённы кантроль, аказваючы ўсялякую дапамогу гаспадарчым арганізацыям у гэтым важнейшым пытанні для нашай вобласці.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 10 сакавіка на фронце не адбылося нічога істотнага. У Выбаргскім заліве нашымі часцямі заняты востраў Варые - Саары. На заходнім беразе гэтага заліва нашы часці занялі мястэчка Нісалахці (Паўночнае). На захад ад горада Піткяранта на Ладажскім возеры нашымі часцямі заняты востраў Вуоратсу. У раёне станцыі Лоімола на чыгунцы Сусяры - Сердабаль узмоцненыя пошукі разведчых партый.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка, пры гэтым збіта 8 самалётаў праціўніка.



ЧЭКЕЛЬ ВЛАДЗІМІР АНДРЭЕВІЧ
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 376.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЕЙ САЮЗА ССР

10 сакавіка Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. І. Калінін уручыў ордэны і медалі ўзнагароджаным.

Ордэны і медалі ўручаюцца групе байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, узнагароджаных за выдатнае выкананне баявых заданняў урада і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць.

За выдатнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць узнагароды атрымліваюць — капітан тав. В. А. Камажозскі і малодшы камандзір М. П. Гарбацюк.

Далей ордэны і медалі ўручаюцца вялікай групе работнікаў чыгунак ім. Ф. Э. Дзяржынскага, Заходняй Ленінскай, узнагароджаных за выдатныя поспехі ў справе ўздыму чыгуначнага транспарта і праяўленыя ўзоры соцыялістычнай працы, а таксама групе работнікаў Беларускай, Калінінскай і Маскоўска-Акруговай чыгунак, узнагароджаных за дасягненні ў справе паляпшэння работы чыгунак і паспяховага выканання спецыяльных заданняў урада.

Пасля ўручэння ордэнаў і медалей тав. М. І. Калінін сардэчна павіншаваў таварышоў з атрыманнем узнагарод і пажадаў ім новых поспехаў у далейшай рабоце. (ТАСС).

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі і Совет Народных Камісараў БССР шлюць Вам, вернаму сыну большэвіцкай партыі, главе Совецкага ўрада, бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна у дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя палкае большэвіцкае прывітанне.

Усё Ваша жыццё і дзейнасць неразрыўна звязаны з дзейнасцю найвялікшых правадыроў пралетарыята Леніна і Сталіна.

У суровыя годы падполля, у барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, у грамадзянскай вайне, у барацьбе з ворагамі народа, з ворагамі соцыялізма, у барацьбе за пабудову і ўмацаванне соцыялістычнага грамадства, — Вы непахісна адстайвалі і беззаветна змагаліся за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна.

З Вашым імем звязаны найвялікшыя перамогі соцыялізма ў нашай краіне. Разам з вялікім Сталіным Вы арганізоўвалі і стварылі вялікае садружжаства народаў — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Верны вучань Леніна і бліжэйшы саратнік правадыра народаў таварыша Сталіна, — Вы з'яўляецеся буйнейшым арганізатарам і кіраўніком большэвіцкай партыі і совецкай улады.

Мудрая знешняя палітыка Совецкага ўрада, майстэрска праводзімая Вамі, яшчэ вышэй узняла міжнародны аўтарытэт і значэнне Совецкага Саюза, расстраіла каварныя планы падпальшчыкаў вайны і забяспечыла мірную працу народаў СССР.

З іменем вялікага Сталіна, натхнёныя Вашым заклікам, часці нашай доблеснай Чырвонай Арміі бліскуча выканалі свой інтэрнацыянальны абавязак і вызвалілі 13 мільёнаў працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Разам з таварышам Сталіным Вы штодзённа аказваеце беларускаму народу дапамогу ў будаўніцтве новага, шчаслівага і радаснага жыцця. Беларусь, у мінулым адсталая, прыгнечаная калонія царызма,ператварылася ў квітнеючую, індустрыяльна-калгасную, ордэнаносную соцыялістычную рэспубліку.

З'еднаны ў адзінай дзяржаве беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ідзе ў першых радах да поўнай перамогі комунізма.

Жадаем Вам ад усёй душы, ад усяго сэрца многіх год жыцця і работы на славу нашай вялікай радзімы, на карысць усіх працоўных, ва славу комунізма.

Няхай жыве Урад першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян і яго глава Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш правадыр, наш бацька, друг і настаўнік таварыш Сталін!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі.

Совет Народных Камісараў БССР.

Вечар, прысвечаны 50-годдзю тав. Молатава

9 лютага на 84 выбарчым участку Слабадскай выбарчай акругі быў праведзен вечар, прысвечаны 50-годдзю з дня нараджэння старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР Вячэслава Міхайлавіча Молатава. На вечары прысутнічала больш 300 выбаршчыкаў.

Даклад аб жыцці і дзейнасці главы Совецкага ўрада выбаршчыкі праслухалі з выключнай увагай. Пасля даклада выступалі агітатары тав. Рыба і Раманчанка, якія гаварылі аб выключнай ролі В. М. Молатава ў соцыялістычным будаўніцтве нашай радзімы. У зале ўвесь час чуліся прывітальныя воклічы ў чэсць таварыша Молатава.

Пасля даклада быў дан канцэрт сіламі Н-скай часці.

І. Б.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

1200 КІЛОМЕТРАЎ НАД МОРАМ

Магадан. Самалёт Дальбуда «Х-258», кіруемы пілотам Максіменка, зрабіў глыбокую лёдавую разведку у Ахоцкім моры. На барту самалёта знаходзіўся капітан ледакола «Красин» тав. Маркаў.

За ўвесь час палёту штурман самалёта т. Ткачэнка вёў назіранні за становішчам ільдоў, бортрадыст Мараўёў трымаў бесперапынную сувязь з авіяатрадам, «Красиным» і іншымі суднамі, якія знаходзіліся ў паўночным сектары Ахоцкага мора. Пасля шасці з паловай гадзін самалёт, праляцеўшы над морам 1200 кілометраў, высветліў поўную карціну лёдавай абстаноўкі.

ГОД РАБОТЫ МАСКОЎСКАГА ТЭЛЕЦЭНТРА

10 сакавіка споўнілася год работы новага тэлевізійнага цэнтра ў Маскве. Гэта дата супадае з 50-годдзем пачатку тэлефаніі ў СССР. За гэты год тэлевідзенне атрымала ў нашай краіне вялікае распаўсюджванне. Начныя тэлевізійныя цэнтры створаны таксама ў Ленінградзе і Кіеве.

ПІТОМНІК ПАЛЯЎНІЧЫХ САБАК

Омск. У Осцяка-Вагульскай нацыянальнай акрузе будуецца пітомнік «Паўночнай астравухай лайкі». У Омскай вобласці, дзе шырока развіт паляўнічы промысел, гэта сабака асабліва каштоўная.



На здымку: Мадэль малалітражнага аўтамабіля, які выпускаецца ў 1940 годзе маскоўскім заводам ім. КІМ. Гэты аўтамабіль мае эмблему КІМ на радыятары абцякаемай формы, вельмі прыгожай знешняй аддзелкі. Вага машыны — 800 кг. 100-кілометравы прабег патрабуе ўсяго 8 літраў бензіну.

СНЕЖНЫЯ ГРЭБЛІ НА ПАЛЯХ

Саратаў. Зіма гэтага года была багата снегападамі. Вышыня снежнага пакрыцця месцамі дасягае 45—50 сантыметраў. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Трудовик», Аткарскага раёна, рашылі затрымаць на палях як можна больш таючай вады. Вясной, калі ў раўчукі і балкі будуць імкнуцца бурныя патокі, шлях іх будзе перагароджан снежнымі грэблямі. Зараз група калгаснікаў пад кіраўніцтвам сельскіх актывістаў тт. Кулагіна і Шылава прыступіла да паладжвання грэбляў.

УКЛАДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ УКРАІНЫ

Масква, 10 сакавіка. У ашчадкасы заходніх абласцей Украіны ўнесена на захаванне больш 1.200.000 рублёў. Насельніцтва Львоўскай вобласці ўнясло на захоўванне 350.000 рублёў.

СЯЎБА ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ У КАЗАХСТАНЕ

Джамбул, 10 сакавіка. У раёне Джамбулаўскай вобласці (Казахстан) пачалася сяўба цукравых буракоў. Джамбулаўскі соўгас сёння закончыў сяўбу.

БАГАТАЕ МЕСЦАНАРАДЖЭННЕ ЗОЛАТА

Фрунзе. На берагах ракі Малы Нарын, у раёне Чэрпекты, знойдзена самае багатае ў Сярэдняй Азіі месцанараджэнне золата. Золата знойдзена і на тэрыторыі Карта (Ункурт), дзе паміма гэтага адкрыта буйнае месцанараджэнне вальфрамавых руд. У бліжэйшы час гэты ўчастак будзе здан у прамысловую эксплаатацыю.

НОВЫЯ ВУГАЛЬНЫЯ ШАХТЫ

Львоў. У гор. Крэменец Львоўскі трэст «Шахтбуд» заклаў дзве вугальныя шахты. У адной з шахт ужо здабыты першыя 300 тон высокаякаснага бурага вугалю, які выкарыстоўваецца мясцовай электрастанцыяй. У гэтым годзе будзе пабудавана 17 новых шахт.

БУДАЎНІЦТВА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ

У бягучым годзе па Мінскай вобласці заканчваецца будаўніцтва новых электрастанцый: у гарадскім пасёлку Узда — магутнасцю ў 88 кіловат і гарадскім пасёлку Чырвоная Слабада— у 80 кіловат.

Будаўнічыя работы ў асноўным закончаны. Апрача гарадскіх пасёлкаў электрастанцыі забяспечаць электраэнергіяй і прылягаючыя калгасы. Кошт будаўніцтва — каля 1.100 тысяч рублёў.

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР і БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 348 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Міхаіл Грыгор'евіч Захараў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Тав. Захараў нарадзіўся ў кастрычніку 1899 года ў сям'і селяніна-бедняка, у сяле Старое Шаткіна, Камешкірскага раёна, Пензенскай вобласці.

Да сямі год жылося бясклопатна, хоць галадна. На восьмым годзе паступіў у пачатковую школу, канчаць якую Міхаілу Грыгор'евічу прышлося ўжо будучы «у людзях». Міхаілу Грыгор'евічу прыходзіцца ўжо ў 1910 годзе ісці з бацькам на заработкі — віць вяроўкі ў адным з памешчыцкіх маёнткаў.

З гэтага часу пачынаецца працоўнае жыццё 11-гадовага хлопчыка. Праца ў гаспадарцы бацькі, служба ў памешчыкаў, у кулакоў, работа на суконнай фабрыцы, на пабудове млыновых грэбляў.

Такое бесперспектыўнае, бязрадаснае існаванне працягваецца аж да 1917 года, калі перад Міхаілам Грыгор'евічам бліснула надзея ажыццявіць заветную мару—вучыцца. У пачатку 1919 года волвыканком камандзіруе яго на курсы культработнікаў. Не гледзячы на забарону бацькі, чалавека адсталага і прыгнечанага, юнак едзе ў горад Кузнецк. Але праз два тыдні яму гавораць, што няма сродкаў на ўтрыманне курсантаў. Міхаіл Грыгор'евіч паступае ў шавецкую майстэрню вучнем, затым у адну з совецкіх устаноў кур'ерам. Днём працуе, а вечарам вучыцца на курсах.

Па сканчэнні курсаў у чэрвені 1919 года ідзе па мабілізацыі ў Чырвоную Армію. Спачатку служыць у 7-м Саратаўскім палку, затым у 95-асобым стралковым батальёне, дзе атрымлівае назначэнне палітасветработніка. Скора яго накіроўваюць у распараджэнне палітаддзела Туркестанскага фронта, узначальваемага ў той час Фурманавым.

Ён служыць з чапаеўцамі. Навучаецца на курсах, якімі кіруе жонка Фурманава.

Пасля курсаў Міхаіл Грыгор'евіч накіроўваецца ў палітаддзел Уральскага ўмацаванага раёна, дзе прымае ўдзел у ліквідацыі праравўшайся пад Уральск банды Сапажкова.

Ва Уральску ён працуе ў палітаддзеле, потым у гарнізонным палітасветаддзеле, пазней займаецца палітасветработай у Кузнецку, а пасля дэмабілізацыі восенню 1921 года паступае на падрыхтоўчае аддзяленне Саратаўскага рабфака.

Навучаючыся на рабфаку, Міхаіл Грыгор'евіч працягвае займацца палітасветработай. У сакавіку 1922 г. ён уступае ў члены ВЛКСМ, вядзе актыўную комсамольскую работу, працуючы членам бюро і адказным сакратаром ячэйкі комсамола.

З 5-га курса рабфака тав. Захараў пераводзіцца ў Маскву на рабфак ім. Свердлова, які канчае ў 1925 годзе і паступае на эканамічны факультэт Тімразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі.

Будучы ў акадэміі, Міхаіл Грыгор'евіч працуе педагогам. Ён выкладае грамадазнаўства ў тэхнікуме, ад якога ў 1929 г. выбіраецца членам Краснапрэсненскага райсовета.

З 1923 года ён член ВКП(б). Ён змагаецца за лінію партыі і дае адпор контррэвалюцыйным вылазкам трацкістаў і іх прыхаснеяў з чаянаўска-кандрацьеўскай групы.

У 1930 г. Міхаіл Грыгор'евіч канчае Акадэмію і вылучаецца ў аспірантуру пры Тіміразеўскай акадэміі, а з восені вучыцца ў аспірантуры пры навукова-даследчым соўгасным інстытуце акадэміі сельскагаспадарчых навук імені Леніна. Аспірантуру канчае ў 1933 г. са званнем дацэнта па арганізацыі гаспадаркі.

Будучы яшчэ аспірантам, Міхаіл Грыгор'евіч пачаў працаваць у Тіміразеўскай акадэміі ў якасці дацэнта па арганізацыі соцыялістычных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

У перыяд з 1931 па 1939 г. Міхаіл Грыгор'евіч вядзе многагранную навуковую, педагагічную і палітычную работу: кіруе навукова-даследчым агародным сектарам, сумяшчае навуковую і педагагічную работу з работай дэкана эканамічнага факультэта.

У маі 1938 г. Міхаіла Грыгор'евіча пераводзяць на работу ў самую вышэйшую і найлепшую ў свеце акадэмію—у ЦК ВКП(б) у якасці намесніка загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам.

Тут Міхаілу Грыгор'евічу прыходзіцца працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам саратніка вялікага Сталіна тав. Андрэева. З незвычайнай цеплынёй, юнацкім захапленнем і любоўю ўспамінае Міхаіл Грыгор'евіч аб гэтым перыядзе сваёй дзейнасці.

— Тут, — гаворыць ён, — маім настаўнікам быў Андрэй Андрэевіч. У яго я вучыўся метаду работы, падыходу да людзей, складанню дакументаў і вырашэнню пытанняў. Тут я прайшоў найлепшую ў свеце школу — школу большэвізма.

Пасля XVIII партыйнага з'езда Міхаіл Грыгор'евіч быў выбран членам Камісіі Партыйнага Кантролю пры ЦК ВКП(б), з 10 чэрвеня 1939 г. назначан упаўнаважаным Камісіі Партыйнага Кантролю пры ЦК ВКП(б) па БССР.

На гэтай вялікай і адказнай рабоце Міхаіл Грыгор'евіч Захараў знаходзіцца і зараз.

Такі вялікі многагранны шлях сялянскага хлопчыка, які марыў быць народным настаўнікам. Гэта шлях сапраўднага сына народа, — шлях большэвіка.

Ільінскі.



На здымку: кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР М. К. Пятроўская гутарыць з рабочымі 1-га тэкстыльнага камбіната г. Беластока. (Фота Сапір).

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 333 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Алексей Гаўрылавіч Румянцаў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

«Усе на Калчака!»—крычаў з плаката рабочы, ускінуўшы руку, у якой была заціснута вінтоўка. Вулічны вецер трапаў шэры, нядаўна прыклеены плакат, і здавалася: рабочы зараз шагне наперад, ускінуўшы трохлінейку на плячо, і пойдзе да вакзала, дзе грузіліся эшалоны.

Перад плакатам стаяў, злёгку сутулячыся, хлапчук год васемнаццаці. Ён доўга глядзеў і аб нечым напружана думаў. Яго ўвагу адцягнуў узбуджаны голас. Прамоўца ў палінялай гімнасцёрцы гаварыў, робячы энергічныя жэсты:

— Таварышы! Калчак пагражае рэволюцыі. Партыя большэвікоў кліча нас на барацьбу з гэтым белагвардзейскім псом. Усе, хто здольны насіць зброю, абавязаны выканаць свой доўг перад Радзімай. Разгромім гадзюку Калчака, сатром яго з твару зямлі!

Хлапчук уважліва ўслухоўваўся ў словы прамоўцы.

Падыходзілі яшчэ і яшчэ людзі ў скураных куртках, з замасленымі вялікімі рукамі. Маленькі, пыльны сквер на ўскраіне Яраслаўля запаўняўся рабочымі бліжэйшых заводаў. Ішоў запіс у атрады па барацьбе з Калчаком.

У той-жа вечар восемнаццацігадовы Алексей Румянцаў быў на вакзале. Ніхто яго не праводзіў: маці знаходзілася ў беднай вёсцы Асташова, Угліцкага раёна, Яраслаўскай вобласці, бацька — працаваў у Петраградзе на аўтазаводзе.

Алексей забраўся ў вагон, паравоз прарэзліва засвістаў, і эшалон рушыў наперад. Адплывалі домікі рабочай ускраіны. Скора горад астаўся ззаду. Адкрыліся неасяжныя палі, павеяла начной прахалодай.

У Самары атрымалі зброю. Зноў паімчаўся поезд на ўсход, пастуквалі калёсы:

— На Калчака! На Калчака!

Было гэта ў грозным 1919 годзе. З гэтага года пачаў тав. Румянцаў службу ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Скончылася грамадзянская вайна. Партыя пасылае тав. Румянцава палітруком у Каўказскую Чырвонасцяжную Армію. У 1924 годзе ён удзельнічаў у падаўленні меншавіцкага контррэволюцыйнага паўстання ў Грузіі. Скончыў ваенна-палітычную школу ў Тбілісі, з восені 1926 года па 1931 год працаваў палітруком, а затым інструктарам палітаддзела ў часцях Азербайджанскай стралковай дывізіі.

У 1931—33 годах працаваў камісарам аднаго з караблёў Каспійскай ваеннай флатыліі. Скончыўшы інстытут пры Ваенна-палітычнай акадэміі імені Леніна, ён выкладаў гісторыю партыі ў Акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА імені Сталіна. Працаваў начальнікам кафедры Ваенна-гаспадарчай акадэміі ў Харкаве, намеснікам начальніка Палітупраўлення Маскоўскай Ваеннай Акругі. А з пачаткам вялікага вызваленчага паходу быў назначан начальнікам Палітычнага ўпраўлення адной з дзеючых армій.

Мерна і дружна ідуць байцы прасёлачнай дарогай міма паваленага пагранічнага слупа з запырсканым граззю аднагаловым арлом. Углядваецца начальнік Палітупраўлення ў твары, глядзіць у вочы праходзячых роўнымі радамі чырвонаармейцаў. Радаснае пачуццё расце ў ім:

— Рвуцца ў бой!

Начальнік Палітупраўлення арміі ў дні гераічнага вызваленчага паходу, асабіста і пасрэдствам партыйна-палітычнага апарата ствараў умовы для паспяховага выканання баявой задачы, дабіваўся ажыццяўлення авангарднай ролі комуністаў і комсамольцаў у гэтых складаных умовах. Клапаціўся аб снабжэнні часцей, унікаў ва ўсе дробязі жыцця байцоў на паходзе. Быстра адклікаўся на ўсе сігналы. Яму стала вядома, што Н-ская часць адстае ў выкананні баявога загаду. Неадкладна паслаў туды двух палітработнікаў. Высветлілася, што дрэнна працуюць тылы. Былі прыняты рашучыя меры—і справа пайшла на лад.

У Белавежскай пушчы засела многа белапалякаў. Большасць з іх — салдаты, гвалтоўна мабілізаваныя панамі рабочыя і сяляне. На што-ж праліваць рабоча-сялянскую кроў?

Параіўшыся з камандуючым, тав. Румянцаў піша адозву. Льюцца агнявыя словы большэвіцкай праўды. Самалёты раскідваюць сотні адозваў над пушчай. Прагна чытаюць салдаты і выходзяць насустрач братам, дапамагаюць чырвонаармейцам сцерці з твару зямлі крываж эрнае афіцар'ё.

Скончыўся вызваленчы паход. Ачышчаны клінкі і штыкі. Новае папаўненне ўліваецца ў роты, эскадроны, батарэі. І нястомна напамінае Румянцаў:

— Выхоўвайце моладзь на баявых традыцыях, рыхтуйце іх да будучых баёў.

Ён загартоўвае партыйна-палітычны апарат у духу пастаяннай баявой гатоўнасці, патрабуе, каб кожны палітработнік добра ведаў ваенную справу і, у выпадку патрэбы, мог замяніць камандзіра. Ён гаворыць:

— У баі трэба быць такім, як граза белафінаў, — батальённы камісар Балаханаў.

Алексей Гаўрылавіч Румянцаў вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 333 выбарчай акрузе. Ён апраўдае вялікае давер'е, якое яму аказваецца.

Хадыка.



На здымку: старшыня фабкома тэкстыльнай фабрыкі № 23 у г. Беластоку тав. А. К. Сідаровіч (другая злева) чытае агітатарам артыкул аб выбарах з «Вольнай працы». (Фота-кліша ТАСС).

АХОВА ЗАКОНАМ ВЫБАРЧЫХ ПРАВОЎ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

У выніку перамогі соцыялізма ў СССР ажыццёўлена паслядоўная, да канца разгорнутая, соцыялістычная дэмакратыя.

Сталінская Канстытуцыя не абмяжоўваецца толькі абвяшчэннем фармальных правоў грамадзян СССР, але забяспечвае фактычнае ажыццяўленне гэтых правоў.

Канстытуцыя СССР устанаўлівае перш за ўсё **усеагульнае выбарчае права.**

Такіх сапраўды ўсеагульных выбараў не ведае і не можа ведаць ні адна буржуазная канстытуцыя. Буржуазія палохаецца народных мас, рабочых і сялян, якія могуць скарыстаць свой удзел у выбарах супроць самой буржуазіі. Вось чаму ў буржуазных краінах і ўводзіцца цэлы рад абмежаванняў у выбарах. Напрыклад, у былой панскай Польшчы права быць выбаршчыкам прадастаўлялася толькі асобе, дасягнуўшай 24-гадовага ўзросту, а права быць выбраным — 30-гадовага ўзросту. Канстытуцыя былой панскай Польшчы прадугледжвала, што пазбаўленне выбарчых правоў можа ажыццяўляцца ў адносінах раду асоб «у сувязі з адсутнасцю ў іх дастатковых маральных або разумовых якасцей». Вядома, што разумелі пад так званымі «маральнымі якасцямі» паны масціцкія і кампанія, якія подла здзекваліся над народам і пазбаўлялі выбарчых правоў мільёны рабочых, сялян і чэсных прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі.

У Францыі зусім адхілены ад выбараў у парламент жанчыны і асобы, якія знаходзяцца на вайсковай службе. У Злучаных Штатах Амерыкі велізарныя масы працоўных адхілены ад выбараў з прычыны адсутнасці ў іх патрабуемага маёмаснага і адукацыйнага цэнза.

Ніякіх падобных абмежаванняў не ведае Сталінская Канстытуцыя. У Совецкім Саюзе ўсе грамадзяне роўныя ў сваіх правах.

Совецкая выбарчая сістэма гарантуе сапраўднае, **роўнае для усіх, выбарчае права.** Арт. 136 Сталінскай Канстытуцыі гаворыць: «Выбары дэпутатаў з'яўляюцца роўнымі: кожны грамадзянін мае адзін голас; усе грамадзяне ўдзельнічаюць у выбарах на роўных падставах». Гэта азначае, што пры выбарах у Советы дэпутатаў працоўных ні адзін выбаршчык, незалежна ні ад службовага становішча, ні ад нацыянальнага паходжання, ні ад маёмаснага становішча, ні ад полу — не мае абсалютна ніякіх пераваг перад другім выбаршчыкам.

Нічога падобнага няма і не можа быць у буржуазных краінах.

Совецкая выбарчая сістэма ажыццяўляе сапраўднае **прамое выбарчае права.**

Прамое выбарчае права, устаноўленае Сталінскай Канстытуцыяй, прадугледжвае такі парадак выбараў у Советы дэпутатаў працоўных, пры якім дэпутаты выбіраюцца самімі выбаршчыкамі непасрэдна (прама).

Прынцып прамых выбараў выражаецца ў тым, што выбаршчыкі атрымліваюць права прымаць удзел у выстаўленні кандыдатаў у дэпутаты і непасрэдна за іх галасаваць.

Арт. 140 Канстытуцыі СССР гаворыць: **Галасаванне пры выбарах дэпутатаў з'яўляецца тайным.**

У адпаведнасці з артыкулам 77 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР і арт. 68 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР, «у памяшканні для выбараў выдзяляецца для запаўнення бюлетэняў асобны пакой, у якім у час галасавання забараняецца прысутнасць каго-б там ні было, у тым ліку членаў Участковай выбарчай камісіі, акрамя галасуючых; пры допуску у пакой для запаўнення бюлетэняў адначасова некалькіх выбаршчыкаў, ён павінен быць абсталяваны перагародкамі або шырмамі па ліку допускаемых адначасова выбаршчыкаў».

Тайнае галасаванне — гэта адно з велізарнейшых заваяванняў совецкага дэмакратызма.

Такія асноўныя і найбольш характэрныя рысы совецкай выбарчай сістэмы.

Совецкі закон устанаўлівае суровае пакаранне для ўсякага, хто ў той ці іншай форме пасягне на існуючую выбарчую сістэму соцыялістычнай дзяржавы. Арт. 100 выбарчага закона Беларускай ССР гаворыць: «Усякі, хто шляхам насілля, абману, пагроз або подкупу будзе перашкаджаць грамадзяніну БССР у ажыццяўленні яго права выбіраць і быць выбраным у Вярхоўны Совет БССР, караецца пазбаўленнем свабоды на тэрмін да 2-х год». Гэта з'яўляецца адной з шматлікіх гарантый, якія забяспечваюць сапраўдную свабоду выбараў, сапраўдны ўдзел у гэтых выбарах усяго совецкага народа.

Нельга забываць, што варожыя элементы ў радзе выпадкаў паспрабуюць праводзіць контррэволюцыйную агітацыю, накіраваную на зрыў выбарчай кампаніі. Гэтыя пасяганні ворагаў народа павінны кваліфікавацца не як простае крымінальнае злачынства, а як контррэволюцыйнае злачынства з выцякаючымі адсюль вынікамі.

Органы суда і пракуратуры павінны пільна вывучаць усе прыёмы варожых элементаў, якія спрабуюць пасягнуць на выбарчую сістэму соцыялістычнай дзяржавы і гэтым самім своечасова і бязлітасна прасякаць усякія прошукі ворагаў. Сурова павінны карацца ўсе тыя асобы, якія будуць шляхам абману, шантажу, пагроз, запалохвання і ўсякіх іншых сродкаў спрабаваць перашкаджаюць грамадзянам ажыццявіць сваё выбарчае права.

Разам з тым органы суда і пракуратуры павінны весці барацьбу і з бюракратычнымі элементамі, якія, карыстаючыся сваім службовым становішчам, будуць нарушаць совецкі Выбарчы закон.

Павышаючы большэвіцкую пільнасць, працоўныя Беластоцкай вобласці дадуць знішчальны адпор усім ворагам, якія паспрабуюць шкодзіць вялікаму свабоднаму волевыяўленню.

Працоўныя Беластоцкай вобласці 24 сакавіка будуць галасаваць за сапраўды лепшых прадстаўнікоў народа, за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, будуць галасаваць за далейшы росквіт соцыялістычнай радзімы, за шчасце ўсіх яе народаў, за шчаслівае жыццё, за нашага роднага бацьку і настаўніка вялікага Сталіна.

Г. Бавыленка,
старшыня Беластоцкага абласнога суда

ПЕРАДАВЫЯ КАЛЕКТЫВЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ДАСТОЙНА СУСТРАКАЮЦЬ ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

6-ты камбінат напярэдадні выбараў

6-ты тэкстыльны камбінат спаборнічае з тэкстыльнай фабрыкай ім. Свердлова ў гор. Клінцах і з маскоўскай фабрыкай „Победа труда“. Рабочы калектыў камбіната змагаецца за пяршынства ў гэтым спаборніцтве. Усе чатыры цэхі заключылі паміж сабой соцдагаворы на датэрміновае выкананне квартальнага плана.

Ткацкі цэх трымае пяршынства па камбінату. Лютаўскі план ён выканаў на 126 процантаў. Перавыканаў свой месячны план і прадзільны цэх. Аддзелачны цэх, які ў лютым меў многа прастояў з-за недахопу фарбы, зараз выконвае дзённую норму на 140—150 процантаў.

Сярод рабочых ткацкага цэха заключаны індывідуальныя соцдагаворы. Ткач Ф. Мазур спаборнічае з тов. Палеем. Яны даюць штодзённа 125 процантаў выпрацоўкі.

На ўсіх станках ткацкага цэха вывешаны таблічкі з прозвішчамі рабочых, дзе штодзённа адзначаецца процант выканання плана.

7 рабочых выказалі жаданне перайсці на абслугоўванне двух станкоў.

Вялікія змены адбыліся ў рабочым быту. 9 лютага адкрылася новая сталоўка, адкрыт медпункт. Абсталяван зубаўрачэбны кабінет. Працуе вячэрняя школа дарослых. 17 сакавіка пачнуць работу 4 гурткі тэхмінімума. Больш 60 рабочых выказалі жаданне павысіць свае тэхнічныя веды, асвоіць новыя тэхнічныя нормы. Рабочыя ткацкага цэха ў сярэднім зарабляюць па 450—500 рублёў у месяц. Свабодны час рабочыя праводзяць у сваім утульным фабрычным клубе.

Рабочыя камбіната актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. 15 рабочых і работніц працуюць агітатарамі на 82 выбарчым участку Совецкай выбарчай акругі. 10 рабочых з'яўляюцца актыўнымі членамі акруговых і ўчастковых выбарчых камісій.

Прывабны і культурны выгляд мае 82 выбарчы ўчастак. Ён упрыгожан сіламі рабочых 6 камбіната. Рабочыя дапамагаюць у выпуску на выбарчым участку насценнай газеты. Выключную актыўнасць у выбарчай кампаніі праяўляюць старыя рабочыя камбіната Сакольскі і Храноўскі.

Калектыў 6-га камбіната даў слова, што вялікае свята—24 сакавіка — ён сустрэне перавыкананнем квартальнага плана, новымі вытворчымі дасягненнямі.

М. Шаховіч

Мы шчаслівыя людзі

Я працую шпулярkай на 12 тэкстыльнай фабрыцы. Пры капіталістах была часовай работніцай і працавала ўсяго толькі адзін — два месяцы ў год. Майго мужа, які змагаўся за інтарэсы працоўных, не дапускалі ні да якой работы. Мы былі вымушаны жыць з дзецьмі ў цеснай і сырой кватэры.

Памятаюцца тыя цяжкія дні, калі я прыходзіла на фабрыку і прасіла фабрыканта, каб ён даў на дзень ці на два работы, але — дарэмна.

Прышла Чырвоная Армія. Фабрыканта выгналі, і фабрыка стала нашай. Беспрацоўе ўжо не пагражае. Мой муж таксама мае работу. Замест цёмнага і сырога падвала мы атрымалі светлую і сонечную кватэру. Маё дзіця знаходзіцца ў яслях. Мы шчаслівы, бо адчуваем усе даброты Сталінскай Канстытуцыі, якая забяспечвае ўсім грамадзянам права на працу.

Мы многа чулі пра нашых кандыдатаў у дэпутаты, пра гераічныя подвігі камандзіра Кавалёва, пра тав. Машэвіцкага, які столькі зрабіў для народнай асветы. Ведаем пра тав. Турлейскага, які адважна падымаў свой голас супроць капіталістаў і памешчыкаў.

Мы будзем горача агітаваць і радасна галасаваць за нашых кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

Ц. Гельбарт.

Шпулярка 12 фабрыкі.



На здымку: Самыя старыя ткачы фабрыкі № 7—9 у г. Беластоку—83-гадовы Ш. Г. Фрэнкель, які праработаў 65 год (злева), і 76-гадовы Т. І. Міклаўскі, які праработаў 53 годы. Зараз, па 130 артыкулу Сталінскай Канстытуцыі, абодва яны ўходзяць на пенсію.

ПАЛІТЫЧНЫ І ВЫТВОРЧЫ ЎЗДЫМ НА НАШАЙ ФАБРЫЦЫ

Уся наша фабрыка № 29 жыве прадстаячымі выбарамі. У нас праводзіцца вялікая палітычная работа. На працягу лютага адбылося тры сходы, на якіх прысутнічала 1400 рабочых і 7 пазменных сходаў з удзелам 1050 чалавек.

У выхадныя дні мы наладжваем у нашым клубе даклады і гутаркі, дзе палітрукі з падшэфных часцей чытаюць даклады на актуальныя палітычныя тэмы. У апошні час былі прачытаны даклады на тэмы: „Аб сталінскай нацыянальнай палітыцы“, „Аб правах жанчын у Совецкім Саюзе“, „Аб Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі“. На гэтых дакладах прысутнічала 3350 чалавек.

Кандыдатамі ў дэпутаты ад нашай фабрыкі вылучаны тт. Кавалёў і Цанава. У сваіх выступленнях на сходах рабочыя фабрыкі тт. Андрэйчук, Разводоўскі, Гельман азнаёмілі ўсіх з біяграфіямі кандыдатаў.

Але мы не абмяжоўваемся толькі масавай работай унутры самой фабрыкі.

На нашай фабрыцы арганізаван семінар для 50 агітатараў. З іх 35 чалавек працуюць на нашым участку, які знаходзіцца блізка ля фабрыкі. Астатнія праводзяць сваю работу там, дзе яны жывуць. Вылучылі 6 членаў участковай выбарчай камісіі тт. Шапіра, Класа, Вільчэўскую і інш., якія добра працуюць. Мы ўпрыгожылі памяшканне выбарчага ўчастка, вывесілі лозунгі.

Рабочыя нашай фабрыкі падтрымліваюць цесную сувязь з выбаршчыкамі нашага ўчастка. Я сам працую агітатарам па Арлянскай вуліцы ў дамах №№ 4 і 6. Выбаршчыкаў мы запрашаем на свае вечары і даклады.

Дзень выбараў сустрэнем новымі вытворчымі поспехамі. Наш план па ткацкаму цэху мы выканалі ў студзені на 125 проц., а ў лютым — на 120. Якасць прадукцыі значна палепшылася. Зменшыўся процант браку. Індывідуальным соцспаборніцтвам ахоплена 130 рабочых, у тым ліку 80 ткачоў, 32 работніцы прадзільнага цэха, двое чысцільшчыкаў, 5 ткацкіх майстраў і т. д. Ткач тов. Э. Кац абавязаўся выконваць план на 120 проц., Замахоўскі—на 117, Худзін і Ліпінскі—на 115 проц. Усе яны вытрымалі свае слова. У нас ужо 8 ткачоў перайшлі на абслугоўванне двух станкоў і перавыконваюць дзённыя заданні. Наватары-двухстаночнікі працуюць агітатарамі.

Увесь калектыў нашай фабрыкі рыхтуецца да выбараў, як да вялікага свята.

Ізраіль Беластоцкі,
двухстаночнік фабрыкі № 29, агітатар.

Расце Індурская комсамольская арганізацыя

Кампанія па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР выклікала вялікі палітычны ўздым сярод моладзі Індурскага сельсовета, Гродненскага раёна. У актыўную грамадскую работу ўключылася ўся передавая моладзь сельсовета. На выбарчых участках, у клубах, сельскім совеце можна штодзённа бачыць маладых агітатараў, чытчыкаў і бяседчыкаў.

Сялянская моладзь вызваленага народа праяўляе надзвычайны інтарэс да вучобы. Вечарамі ў школах дарослых, на занятках палітычных гурткоў моладзь павышае свой агульна-адукацыйны і палітычны ўзровень. Заняткі наведвае звыш 100 чалавек. Разам з гэтым 50 чалавек лепшай несаюзнай моладзі ў гуртку, арганізаваным комсамольскай арганізацыяй, вывучае праграму і статут ВЛКСМ. Яны рыхтуюцца стаць членамі ленінска-сталінскага комсамола.

Нядаўна створаная пярвічная комсамольская арганізацыя ў Індурах карыстаецца ўжо сярод сялян заслужаным аўтарытэтам. Яна з'яўляецца надзейным памочнікам бальшэвіцкай партыі. Комсамольскай арганізацыяй кіруе кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Лашак Васілій Міхайлавіч.

Звыш 30 маладых выбаршчыкаў актыўна праводзяць масавую палітычную работу. Яны кіруюць гурткамі па вывучэнню выбарчага закона, праводзяць гутаркі. Комсамольцамі арганізаваны самадзейныя калектывы, якія паспяхова выступаюць на выбарчых участках з паказам мастацкай самадзейнасці. Работай мастацкіх калектываў кіруе комсамолец тав. Беразуеў.

Наглядаецца вялікая цяга працоўнай моладзі ў комсамол. Заявы аб прыёме ў рады ЛКСМБ падаюць лепшыя актывісты. Комсамольская арганізацыя налічвае ўжо 11 членаў. Днямі прынят ў комсамол селянін-бядняк тав. Смолка Владзімір, які працуе агітатарам на выбарчым участку. У сваім гуртку ён добра наладзіў работу з выбаршчыкамі, карыстаецца ў іх вялікім аўтарытэтам. У дні барацьбы з польскай белагвардзейшчынай тав. Смолка з вінтоўкай у руках у атрадах міліцыі дапамагаў Чырвонай Арміі граміць польскіх паноў.

У члены ЛКСМБ прыняты актыўныя работнікі ўчастковай выбарчай камісіі тав. Лур'е Баша, Трубачэк Ольга, прапагандыст Юшкевіч Міхаіл і іншыя. На апошнім пасяджэнні Гродненскага РК ЛКСМБ зацверджаны пастановы Індурскай комсамольскай арганізацыі аб прыняцці ў яе рады новых сем членаў.

В. Гарбанёў.

У вёсцы Жэбры

Вёска Жэбры, Крынкаўскага раёна, знаходзілася радам з маёнткам пана Дашкевіча. Памешчык жорстка эксплаатаваў сялян. Сяляне павінны былі штодзённа ісці на работу да памешчыка. Сваю-ж работу ім прыходзілася выконваць ноччу.

За працу ў памешчыка сяляне атрымлівалі жабрацкі заработак—50 грошай у дзень. Галоднае сялянства вымушана было ісці на паклон да памешчыка, пападала ў кабалу. Дашкевіч за сродкі працоўных купляў адзін маёнтак за другім.

Зараз адкрылася новая старонка ў жыцці сялян вёскі Жэбры. Крывасмока пана Дашкевіча не стала. Яго зямля раздзелена паміж батракамі і малазямельнымі сялянамі вёскі. Зараз сяляне дзейсна рыхтуюцца да першай бальшэвіцкай вясны.

У вёсцы нядаўна адкрыт клуб. У клубе маецца мастацкая літаратура, журналы і газеты, устаноўлен радыёпрыёмнік. Кожны вечар у клуб збіраюцца сяляне, чытаюць газеты, кнігі, вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон.

Ю. Тарасевіч

ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ СУСТРАКАЮЦЬ У КАЛГАСЕ

Падрыхтоўка да вясенняй сяўбы ў Лапскім раёне разгортваецца з кожным днём. У раёне працуе 40 кузняў. Амаль ва ўсіх сельсоветах арганізаваны і працуюць зернаачышчальныя пункты.

Вясеннюю сяўбу сяляне пасёлішчаў Турок, Цітова і Дабрычын у колькасці 60 гаспадарак аднадушна рашылі праводзіць калектыўна. 40 батрацкіх і 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгас.

Ігнаценка.

Гарады вызваляемай Фінляндыі

ВЫБАРГ

Выбарг, адзін з буйнейшых гарадоў вызваляемай Фінляндыі, размешчан у 6—7 гадзінах язды ад Ленінграда.

Гісторыя захавала вельмі мізэрныя звесткі аб раннім перыядзе існавання гэтага горада. Вядома, што ўжо ў X стагоддзі востраў Б'ёрке, які знаходзіцца ў далёкім кутку Выбаргскай бухты, з'яўляўся цэнтрам ажыўленага гандлю. У канцы XIII века гэты востраў зрабіўся аб'ектам пільнай увагі Швецыі, якая выбрала яго апорным пунктам для ажыццяўлення сваіх заваёўчых планаў супроць Расіі.

У 1293 годзе на востраве, акружаным праліваmi, апякун шведскага караля Біргера генерал-фельдмаршал Торкель Кнутсон пабудаваў замак, названы Выбаргам, які павінен быў быць фарпостам шведскага ўладарніцтва на ўсходзе. Паступова вакол гэтага замка вырасла моцная ваенная крэпасць, а затым і горад.

За ўладанне Выбаргам вялася незлічоная колькасць войнаў Швецыяй, Даніяй, Польшчай і Расіяй. Да сцен Выбарга пасылаў палкі Вялікі Ноўгарад. За Выбарг біліся войскі Івана III. Восем разоў Выбарг знішчаўся пажарамі. Пасля вялікай Паўночнай вайны, якая цягнулася 21 год, Выбарг быў далучан да Расіі.

Гісторык расказвае аб гэтым: асада Выбарга была праведзена пры выключна неспрыяючых абставінах. 13-тысячны корпус, пад камандаваннем графа Апраксіна, у люты мароз зрабіў здзіўляючы пераход па мёртвай ледзяной пустыні з Кранштадта да Выбарга. Іншакраінныя ваенныя наглядальнікі былі здзіўлены незвычайнай трываласцю, самаадданасцю і гераізмам рускіх войск. Калі пачаў сходзіць лёд з Фінскага заліва, на дапамогу корпусу Апраксіна, які пераживаў вастрэйшую нястачу ў правіянце, рушыў на чале флатыліі Пётр I. Царскай флатыліі на працягу многіх дзён прышлося змагацца з ільдамі.

12 тыдняў цягнулася асада Выбаргскай крэпасці. Жорсткія баі ішлі адзін за другім. У сярэдзіне чэрвеня 1710 года крэпасць Выбарг здалася, і 14 чэрвеня Пётр на чале рускіх войск уехаў у горад.

Па прычыне ўзяцця Выбарга Пётр I сказаў: «Моцная падушка Санкт-Пецярбургу наладжана праз дапамогу боскую».

З пакарэннем Выбарга плаванне рускага флота ва ўсходняй частцы Фінскага заліва стала больш безапасным. Вось чаму цар рашыў тады, што Выбарг «значна мацаваць належыць».

Наколькі правільным быў гэты пункт гледжання Пятра, паказалі паследуючыя падзеі. На працягу многіх дзесяткаў год Выбарг прабавалі скарыстаць у барацьбе супроць Расіі.

* * *

Імперыялісты імкнуліся ператтварыць Выбарг у фарпост для варожых дзеянняў супроць СССР. Белагвардзейскія, буржуазна-памешчыцкія правіцелі Фінляндыі прадаставілі Выбарг і Выбаргскую губерню іншакраінным генеральным штабам, і ў першую чаргу генштабам Англіі і Францыі, для будаўніцтва ваенных умацаванняў, ваенна-харчовых баз. Фактычнымі гаспадарамі ў Выбаргу былі англійскі і французскі генштабы. Выбаргская губерня разглядалася белафінамі і іх гаспадарамі — іншакраіннымі імперыялістамі, — як важнейшы плацдарм для ажыццяўлення ваеннай інтэрвенцыі супроць СССР, для нападу на Ленінград.

У раёне Выбарга былі сканцэнтрываны адборныя часці белагвардзейскіх манергеймаўскіх, шуцкораўскіх банд. Тут з асаблівай актыўнасцю развівалася дзейнасць антысовецкага шпіёнска-дыверсійнага «Карэльскага акадэмічнага таварыства», якое адкрыта пракламіравала, што мэтай яго з'яўляецца стварэнне «Вялікай Фінляндыі», з уключэннем Ленінграда ў якасці сталіцы і раду іншых совецкіх тэрыторый аж да Уральскіх гор.

Выбарг быў цэнтрам рэвалюцыйнай барацьбы фінскага пролетарыята царскай Расіі. У Выбаргу і яго раёнах разыгрывалася трагедыя апошніх дзён існавання рэвалюцыйнай улады ў Фінляндыі. У пачатку красавіка 1918 года ў порт Ганге на 10 акіянскіх параходах, суправаджаемых 30 ваеннымі суднамі, прыбылі іншакраінныя інтэрвенты для барацьбы з рэвалюцыйным фінскім пролетарыятам.

14 красавіка пасля ўпорных вулічных баёў белагвардзейцы занялі Гельсінгфорс, потым паў Тамерфорс. Сілы інтэрвентаў былі кінуты супроць Выбарга. У дапамогу ім у Ловізе быў высаджан яшчэ адзін дэсант іншакраінных войск. У раёне Котка Ярвіла-Лахці 30-тысячная армія фінскіх чырвонагвардзейцаў была акружана белагвардзейцамі і інтэрвентамі. Камандаванне чырвоных войск рашыла сілай прабіцца скрозь кальцо ворагаў. Але толькі паўднёвай калоне яе, лікам у 5000 чалавек, удалося прабіцца з варожага акружэння і адступіць у Совецкую Расію. За некалькі дзён да гэтага, 29 красавіка, фінскія белагвардзейцы і інтэрвенты ўзялі Выбарг. Пачалася дзікая, нечуваная расправа манергеймаўскіх банд над безабаронным рабочымі і сялянамі. Тысячы чырвоных байцоў былі расстраляны.

* * *

Выгаднае геаграфічнае становішча Выбарга — ля Фінскага заліва, у вусці Сайменскага канала — дало яму магчымасць стаць адным з галоўных гандлёвых портаў Фінляндыі.

Выбарг з'яўляецца таксама адным з буйнейшых цэнтраў лесаапрацоўваючай прамысловасці і лесаэкспарта. У аколіцах горада размешчана многа лесаапрацоўваючых прадпрыемстваў. Ён з'яўляецца таксама важным цэнтрам сельскай і малочнай гаспадаркі. Па насельніцтву Выбарг стаяў на чацвертым месцы пасля Хельсінкі, Турку і Тамперэ.

Пры дапамозе вялікага Совецкага Саюза і яго гераічнай Чырвонай Арміі старажытны Выбарг адным з першых вялікіх гарадоў Фінляндыі вызваляецца ад манергеймаўскіх банд.

Б. Баратаў.

ЗА РУБЯЖОМ

ПРЫЁМ У ПАЎПРЭДСТВЕ СССР У БЕРЛІНЕ

Берлін, 10 сакавіка. (ТАСС). Учора, 9 сакавіка, у паўпрэдстве СССР ў Берліне ў сувязі з падпісаннем 11 лютага савецка-германскага гаспадарчага пагаднення адбыўся прыём прадстаўнікоў германскіх прамысловых кругоў. На прыёме прысутнічалі паўнамоцны прадстаўнік СССР у Германіі тав. Шкварцэў, Народны камісар суднабудаўнічай прамысловасці СССР тав. Тэвасян, гандлёвы прадстаўнік СССР у Германіі тав. Бабарын і інш. супрацоўнікі паўпрэдства і торгпрэдства. З германскага боку прысутнічалі асобаўпаўнаважаны германскага ўрада па эканамічных пытаннях п. Рыхтэр, кіраўнік германскай гаспадарчай дэлегацыі па перагаворах з СССР п. Шнурэ, штабс-сакратар міністэрства замежных спраў п. Кеплер і інш.

Паўпрэд СССР у Германіі тав. Шкварцэў у кароткім слове ўказаў, што падпісанне 11 лютага гаспадарчага пагаднення мае для СССР і Германіі вялікае эканамічнае і палітычнае значэнне. Пагадненне паміж гэтымі двума дзяржавамі аснавана на ўзаемных выгадах і забяспечвае далейшае развіццё эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва паміж СССР і Германіяй.

У адказным прывітальным слове п. Рыхтэр адзначыў, што заключэнне германа-савецкага гаспадарчага пагаднення з'яўляецца выражэннем волі германскага і савецкага народаў да дружаскага палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва.

Прыём прайшоў у дружаскай абстаноўцы.

ВЫСТУПЛЕННЕ ГІТЛЕРА

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што 10 сакавіка рэйхсканцлер Гітлер выступіў з кароткай прамовай, прысвечанай памяці паўшых у вайне 1914—1918 гг., а таксама ў цяперашняй вайне.

Адзначыўшы, што мэтай ворагаў Германіі з'яўляецца яе расчляненне, Гітлер заявіў, што ў адказ на гэта Германія будзе змагацца „за найбольшае адзінства, чым гэта было калі-небудзь у гісторыі". Гітлер зноў падкрэсліў гатоўнасць Германіі весці навязаную ёй Англіяй і Францыяй вайну да пераможнага канца. „У гэты знамянальны дзень,— сказаў ён, — мы ўсе павінны даць урачыстую клятву, што навязаная вялікай Германскай імперыі капіталістычнымі ўрадамі Францыі і Англіі вайна павінна стаць найвялікшай ў германскай гісторыі перамогай над ворагамі".

(ТАСС).

На заходнім фронце

Берлін, 11 сакавіка. Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «На заходнім фронце ніякіх асаблівых падзей. Германская авіяцыя працягвала разведкі над усходняй Францыяй».

(ТАСС).

ВАЙНА НА МОРЫ

Берлін, 11 сакавіка. (ТАСС). Англійскія ўлады ў Гібралтары затрымалі амерыканскі параход з грузам жалеза для Турцыі. Груз канфіскаван і выгружан на востраве Мальта. Іншыя тавары з ЗША, якія прадназначаны для Турцыі, будуць перададзены заказчыкам пасля праверкі дакументаў англійскім консульствам у Стамбуле.

Нью-Йорк, 11 сакавіка. (ТАСС). Англійскі параход «Бортуік» наскочыў на міну каля Зееланда (Галандыя) і затануў. Каманда выратавана.

Каманда германскага парахода, які вышаў з Кюрасае 5 сакавіка, падпаліла яго. але англійскі ваенны карабль патушыў пажар і захапіў параход.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што Гітлер назначыў Бюлера штадт-сакратаром генерал-губернатарства польскіх раёнаў.

—о—

У Монтэвідэо (Уругвай) у час кінасеанса ў клубе германскай калоніі выбухнула бомба. Выбух пацягнуў за сабой разбурэнні і пажар. Афяр няма. Вінаўнікі яшчэ не знойдзены. Па словах германскага інфармацыйнага бюро, гэты выбух быў падрыхтаван не без удзелу англійскай разведкі.

—о—

У Францыі 3 сакавіка адбыўся перапіс насельніцтва, на аснове якога будуць выданы прадуктовыя карткі.

—о—

У Італіі з 10 сакавіка цэны на мяса павышаны на 60%, на малако, масла і сыр — на 20%.

ТЭАТР

„МЯШЧАНЕ"

П'еса М. Горкага «Мяшчане» паказана на беластоцкай сцэне. Вялікі пралетарскі пісьменнік, буравеснік рэвалюцыі, гаварыў з намі. Спектакль 2-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра дазволіў нам адчуць дыханне горкаўскага генія. Зачараваныя вобразамі вялікага пісьменніка, мы мысленна перанесліся па крайняй меры на тры дзесяцігоддзі назад. Мы ўбачылі кавалак старой Расіі.

Страсна любячы Расію, Горкі ненавідзеў яе жыццёвы ўклад, цемнату і рабства. Ён балеў за зняважаных, ён змагаўся супроць прыгнятальнікаў. Ён заклеймаваў пагардай жыхароў гарадкоў Акуравых і тое мора мяшчанства і подласці, у якіх яны барахталіся.

Нельга ні на мінуту забываць эпоху, у якую ствралася п'еса «Мяшчане». Гэта быў час, калі адна частка рускай інтэлігенцыі — вельмі нязначная — прадаўжала, разам з пралетарыятам і партыяй Леніна— Сталіна, аставацца на рэвалюцыйных пазіцыях. Другая-ж частка — перайшла на ліквідатарскія пазіцыі пад уплывам здраднікаў меншавікоў, якія былі напалоханы рэакцыяй. Гэта была пара, калі на паверхню ўсплывалі ўсялякія «богашукальнікі» і рэвізіяністы, калі адкрыта прапагандавалася супрацоўніцтва з буржуазіяй, вучэнне аб гармоніі класавых інтарэсаў і іншыя. Толькі Ленін і Сталін, толькі партыя бальшавікоў адстаівала тады асновы марксізма супроць здраднікаў рэвалюцыі.

Горкі разам з бальшэвікамі змагаўся супроць апартуністаў. Агнём сваёй творчасці запальваў ён людзей.

«Мяшчане» — п'еса, якая адлюстроўвае ў вядомай меры тую эпоху. Усе дзеючыя асобы п'есы можна падзяліць на тры групы. Старык Бесеменаў узначальвае людзей старога, уходзячага свету. Яго сын Пётр і дачка Тацьяна — прадстаўнікі другога пакалення, разгубленага, бязвольнага і бяссільнага. І. Ніл, які смела ідзе ўперад, упэўнены ў сваёй сіле, увасабляе ў сабе будучую перамогу пралетарыята.

Савецкія тэатры не раз ставілі гэтую п'есу. Іншыя з іх трактуюць яе як цяжкую драму. Пётр, Тацьяна — асуджаныя лёсам людзі. Яны змагаюцца, яны думаюць аб нечым светлым, добрым. Але жыццё не ўдаецца ім.

Другі Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр адказаўся ад такога няправільнага талкавання п'есы «Мяшчане». Гэта п'еса глыбокага і яркага аптымізма. Няхай хвалююча і моцна сумуе і не разумее старык Бесеменаў, няхай імкнецца пакончыць самагубствам нікому не патрэбная Тацьяна, няхай заводзіць да сябе разгубленага Пятра ўдава-кватэрантка: ні адзін з гэтых фактаў нічога яшчэ не рашае. Машыніст Ніл і дачка чудакаптушніка Поля — вось хто прыдае п'есе яе сцвярджаючы, аптымістычны характар.

Разумеючы так Горкага, пастаноўшчык І. А. Ваньяр і Б. П. Тамарын не скупяцца на фарбы, не баяцца бадрасці і вяселля. У час спектакля глядач часта смяецца.

Мастаку Аронаву ўдалося знайсці правільны, адпаведны замыслам пастаноўшчыкаў, тон афармлення спектакля. Гэта сапраўды комната ў доме расійскага мешчаніна. Спектакль афармлен пад яўным уплывам Маскоўскага мастацкага тэатра. Гэтага ўплыву тэатру нечага баяцца; ён можа ім толькі ганарыцца.

Ролю Бесеменава выконвае народны артыст БССР А. К. Ільінскі. Іграе ён выдатна. Адчуваеш, што іграе майстар, які глыбока і правільна разумее Горкага. А. К. Ільінскі не пазбавіў Бесеменава ні адной чалавечай рыскі. Бесеменаў у яго жывы, пераживаючы чалавек. Паглядзіце, як шагае па сцэне, ўгледзьцеся ў паходку гэтага чалавека, кіньце погляд на яго некалькі стаптаныя, але не знасімыя «гаспадарскія» боты, успомніце, з якой прагавітасцю хапае ён шчоты, калі яму прыносяць кватэрную плату. А з якой горачу гаворыць ён дзецям: «...Я вам, як чужы. А я-ж люблю вас... Люблю. Разумееце вы, што значыць — любасць?...»

Да, А. К. Ільінскі ў праве ганарыцца сваім Бесеменавым. Ён лагічны, паслядоўны, пераканаўчы.

Пятра іграе артыст С. В. Скальскі. Моцна запамінаецца гэта фігура. Рукі, глыбока засунутыя ў карманы студэнцкага тулупа, такі бодры, упэўнены шаг — і ўсё-ж глядач не верыць ні адной мінуты не верыць ні ў гэту энергічную паходку, ні ў гэты громкі голас. С. В. Скальскі змог за знешняй маскай паказаць усю нікчэмнасць Пятра.

Ніл, у выкананні артыста А. Г. Шэлег, ясны і натуральны.

Вельмі тонка іграе птушніка Перчыхіна заслужаны артыст БССР П. С. Малчанаў. Не гледзячы на знешнюю мітуслівасць, Перчыхін, якога мы бачым, унутрана ўраўнаважан. Роўна, мягка выконвае ролю Полі артыстка М. С. Бялінская. Як заўсёды, упэўнена і моцна іграе артыстка Е. П. Радзялоўская. Яна дае верны вобраз Елены Нікалаеўны — удавы-кватэранткі.

Што датычыцца ігры артыста З. С. Вялікага, які стварыў выдатны вобраз п'яніцы Цецерэва, то яна заслугоўвае быць асобна адзначанай. Гэты сапраўды тыпічная фігура старой Расіі, страшная і недарэчная.

Не можам толькі згадзіцца з ігрой артысткі Е. І. Лагаўской, выконваючай ролю кухаркі Сцепаніды. Занадта ўжо яна яе шаржыруе. Правільней было-б паказаць Сцепаніду забітай жанчынай, а не вясёлай кумушкай.

Пастаноўкай «Мяшчане» калектыў другога Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра паказаў, на што ён здолен.

І. Паўлаў.

АДКРЫЦЦЁ ПОЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА

11 сакавіка ў Гродна адбудзецца адкрыццё Польскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра пад мастацкім кіраўніцтвам тав. Чэнгеры.

Новы тэатр выступае з прэм'ерай п'есы Шылера «Коварство и любовь», у пастаноўцы вядомага рэжысёра тав. Венгеркі.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР

Беластоцкі шахматна-шашачны клуб з 8 сакавіка арганізоўвае вялікі агульнагарадскі турнір, прысвечаны выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У турніры прымуць удзел лепшыя шахматысты горада—Барын, Бабкес, Беркнер і іншыя.

Прадстаячы розыгрыш з'явіцца чэмпіянатам горада. Пераможцы атрымаюць званне чэмпіёнаў Беластока па шахматах на 1940 год. Турнір разлічан на два месяцы.



Продаж выбарчай літаратуры на вуліцах г. Беластока. (Фота Сапір).

ПА БЕЛАСТОКУ І ВОБЛАСЦІ

ДАРОГА ГРОДНА — КВАСОЎКА

Па ініцыятыве моладзі вёсак Лаша і Індуры (Гродненскі раён) раённы сход маладых выбаршчыкаў прыняў рашэнне сіламі комсамольцаў і несаюзнай моладзі пабудаваць шасейную дарогу Гродна — Квасоўка. Бюро РК ЛКСМБ у сваім рашэнні ўхваліла гэты пачын моладзі і намеціла канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню будаўніцтва дарогі.

Новая дарога будзе пабудавана працягласцю ў 11 кіламетраў. Усё будаўніцтва намячаецца скончыць у 15 працоўных дзён. Дарожны аддзел аблвыканкома склаў тэхнічны праект будаўніцтва дарогі. Раённы дарожны аддзел асігнаваў на будаўніцтва новай дарогі 50.000 рублёў.

Зараз на трасе будучага будаўніцтва пачата загатоўка будаўнічых матэрыялаў — камня і лесу. На дарозе будзе працаваць 2000 комсамольцаў і несаюзнай моладзі.

—о—

АГІТПАЯЗДЫ

Палітаддзелам Беластоцкай чыгункі разам з абкомам партыі арганізаван і пушчан па напрамку Граева агітпоезд, які будзе праводзіць агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў малых станцый і раз'ездаў. Пры агітпоездзе ёсць кінаперасоўка, радыёпрыёмнік і літаратура.

У бліжэйшыя дні заканчваецца абсталяванне другога агітпоезда, які будзе накіраван па лініі Чыжава і Ломжа.

Агітпоезд будзе мець усё неабходнае абсталяванне, а таксама групу лектараў. Ён будзе абслугоўваць не толькі чыгуначнікаў, але і насельніцтва навакольных вёсак.

—о—

АРТЫСТЫ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

У гор. Беластоку з ліку артыстаў Дзяржфілармоніі, джаз-аркестра і ансамбля песні і пляскі арганізавана 12 артыстычных агіткалектываў, якія будуць выступаць на выбарчых участках.

АБУТКОВЫЯ ФАБРЫКІ Ў БЕЛАСТОКУ

Па пастанове СНК БССР і аблвыканкома Беластоцкай вобласці абуткаскуртрэстам заходніх абласцей у першым поўгоддзі 1940 года пускаецца ў эксплаатацыю механізаваная абутковая фабрыка, якая будзе выпускаць 2.000 пар абутку ў дзень пры рабоце ў 2 змены. На фабрыцы будзе працаваць 600 рабочых.

Акрамя гэтага скурабуттрэст прыступае да арганізацыі абутковай фабрыкі індывідуальнай пашыўкі. Фабрыка будзе выпускаць 400 пар абутку ў дзень. На ёй будзе працаваць 350 рабочых.

Б. Андрэеў.

—о—

ПІТОМНІК ФРУКТОВЫХ І ДЭКАРАТЫЎНЫХ ДРЭЎ

У Гродненскім раёне ў былым маёнтку Петрапаль арганізаван дзяржаўны пітомнік па вырошчванню фруктовых і дэкаратыўных дрэў. Пітомнік ужо мае 8 га саджанцаў фруктовых і 8 га дэкаратыўных дрэў.

Акрамя таго ў раёне, у былым маёнтку Грандзічы, створан другі пітомнік, які ў бліжэйшы час будзе расшыран. Плошча яго будзе 40 гектараў.

—о—

СПАРТЫЎНАЕ ТАВАРЫСТВА «ХАРЧАВІК»

Па рашэнню агульных сходаў рабочых і служачых «Харчпрамгандлю» у Беластоку створан спартыўны клуб «Харчавік». Клуб будзе праводзіць масавую фізкультурную работу сярод рабочых і служачых харчовай прамысловасці. Вялікае месца ў рабоце клуба будзе займаць футбольная група юнакоў. Узрост удзельнікаў групы не перавышае 19 год. У хуткім часе спартсмены - юнакі прыступяць да трэніровачных заняткаў.

——«о»——

ІСПЫТЫ НА ПЕДКУРСАХ

У апошнія дні па вечарах у абласным аддзеле народнай асветы назіраецца надзвычайнае ажыўленне. Сюды па выкліку прыёмнай камісіі педкурсаў з розных куткоў вобласці збіраецца моладзь на іспыты.

Адзін за адным у пакой камісіі заходзяць жыццерадасныя юнакі і дзяўчаты, дзеці вызваленага народа.

Вось да стала камісіі падыходзіць светларусы юнак Пётр Басалай, сын селяніна вёскі Рыбалоў, Свіслацкага раёна. Навучанне вялося на польскай мове. Народная беларуская мова была забаронена. Але Пеця Басалай добра ведаў сваю мову. Пасля заняткаў у школе ён старанна вывучаў беларускую граматыку, чытаў беларускія кнігі. Не раз ён у школе перад таварышамі з гордасцю дэкламаваў беларускія вершы. Але аднаго разу папаўся. Мелам на дошцы ён напісаў цэлы куплет цікавага беларускага верша. Наскочыў настаўнік. Усю школу падняў на ногі.

— Заразу бальшэвіцкую прынеслі ў школу! — крычаў ён.

У пакаранне ён так пацягнуў Пецю за вушы, што аж храсткі трэснулі і кроў палілася. Затым цэлы дзень на каленках трымаў.

Заветная мара Басалая ажыццявілася. Гэтымі днямі ён атрымаў радасную вестку, ад якой сэрца яго пачало біцца мацней і часцей. Тав. Басалай залічан на шасцімесячныя педкурсы. Ён цвёрда абяцае добра вучыцца, аддаць усю сваю маладую кіпучую энергію на справу свабоднай соцыялістычнай радзімы.

——«о»——

ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР

10 сакавіка ў Доме партасветы адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Вечар адкрыў тав. Смальянаў, які адзначае велізарную ролю інтэлігенцыі, а асабліва пісьменнікаў, мастакоў, і артыстаў у правядзенні выбарчай кампаніі.

З цікавым дакладам аб сучаснай савецкай беларускай літаратуры выступіў пісьменнік тав. Вольскі.

— Да Кастрычніцкай рэвалюцыі,— гаворыць тав. Вольскі, — беларуская мова была ў загоне. Вялікая рэвалюцыя дала беларускаму народу сваю дзяржаўнасць і стварыла ўсе ўмовы для развіцця сваёй літаратуры. Беларуская мова зараз гучыць ва ўсіх кутках рэспублікі.

У сучаснай беларускай літаратуры маюцца ўсе жанры творчасці. Творы беларускіх пісьменнікаў перакладзены на многія мовы іншых народаў Савецкага Саюза. Беларускія пісьменнікі арганічна злучаны не толькі са сваім народам, але таксама з усімі народамі вялікага Савецкага Саюза.

Пасля даклада тав. Вольскага выступілі з чыткай сваіх твораў: паэт-ордэнаносец т. Глебка, польскія пісьменніцы тт. Бранеўская і Сельм, яўрэйскі паэт т. Рубінштэйн, беларускі пісьменнік тав. Якімовіч, яўрэйскія паэты тт. Бурштэйн і Кнапгайс.

В. Бемаў.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 325.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.